

■ Нефармат

# НЕ СПРАБУЙ ПАДМАНУЦЬ АНЁЛА-АХОЎНІКА

**Дакладна не ўспомню, сем ці восем гадоў таму, а можа і больш, давялося пісаць пра аддзяленне дзённага знаходжання інвалідаў у адным з немалых райцэнтраў. Тады яго толькі што адкрылі ў горадзе. І сапраўды гэта выглядала падзеяй не толькі ў справе падтрымкі людзей з абмежаванымі магчымасцямі, але і ў сэнсе выхавання міласэрнасці.**

Было відавочна, што падзякі заслугоўвае кіраўнік названай структуры, жанчына энергічная ды ініцыятыўная. За даволі кароткі час яна змагла арганізаваць групу валанцёраў з моладзі, якія прыходзілі ў цэнтр, дапамагалі маладым інвалідам, падтрымлівалі іх псіхалагічна. Пажылая супрацоўніца цэнтра сказала, што ў кіраўніцы талент знаходзіць такіх людзей. Далёка не кожны член грамадства гатовы сёння на шчырыя стасункі з людзьмі, якія трапілі ў бяду... Там я звярнула ўвагу на маладога мужчыну ў інвалідным калясцы, які весела перамаўляўся з дзвюма дзяўчынамі. Прыгажун, падобны на героя першай старонкі глянцавага часопіса, забаўляў сваіх суразмоўніц дасціпнымі жартамі, у адказ яны пырскалі дружным смехам, і па чарзе падвозілі каляску. Гэту сцэну мы назіралі з кіраўніцай цэнтра з акна яе кабінета.

На маё маўклівае пытанне жанчына ўздыхнула і коратка расказала яго гісторыю. Дзве вышэйшыя адукацыі, несумненныя перспектывы ў жыцці перакрэсліла аварыя. Усё рабіў прыгожа, імкліва, а хуткасць у машыне не различыў. Траўма пазваночніка зрабіла нерухомымі ногі, нават рукі слухаюцца гаспадара з цяжкасцю. Некалькі гадоў быў у дэпрэсіі, як здараецца з многімі, потым знайшоў у сабе сілы выйсці з дому. Цяпер дапамагае іншым. Я запомніла яе словы, сказаныя з нейкай нават жорсткай роспачну: «Будзь ён здаровым, гэтыя дзяўчаты ў ложак да яго скакалі б, калі не кожная, то праз адну, а цяпер яны яму — валянцёркі, памочніцы...»

Такім чынам перад намі было толькі адно ўвасабленне цаны, заплачанай за неабачлівасць на дарозе, за хуткасць, якая аддае даніну смерці фактычна штодзень. Здаецца, Жванецкі ў адным са сваіх маналогаў казаў: «Не вадзіце машыну хутчэй, чым лётае ваш анёл-ахоўнік». А колькі з нас ігнаруе свайго анёла, і не толькі на дарозе?

Прыведзеная вышэй гісторыя згадалася ў бальніцы, куды ўжо месяц хаджу праведваць сяброўку. Хворыя па палаце мяняюцца. А ў мінулыя выхадныя ўбачыла новую. Дзяўчыне 28 гадоў, лічы ўжо год яна пражыла ў розных бальніцах пасля цяжкага інсульту. Некалькі месяцаў праляжала, як сама расказвала, не асаблівa спадзяваліся ні маці, ні медыкі, што яна стане на ногі. Але знайшоўся доктар, якому яна вельмі ўдзячная за тое, што не пабаяўся прымяніць методыку на мяжы эксперымента. У выніку маладзіцу на ногі паднялі. Цяпер яна ходзіць не вельмі яшчэ ўпэўнена, але сваімі нагамі. Перавялі вось з райцэнтра ў Брэст, гавораць, што далейшае лячэнне, прафесійная рэабілітацыя і здаровы лад жыцця могуць даць вельмі станоўчыя вынікі. Здавалася б, трэба радавацца, што для чалавека, які пабываў амаль на тым свеце і ледзь не змірыўся з цяжкай інваліднасцю, загарэўся агеньчык надзеі. Радавацца і дапамагаць урачам у іх намаганнях. Яна ж... пяць разоў на дзень, а то і болей бегае курыць. Доктар і сварылася, і ўгаворвала абмежавацца адной цыгарэтай на дзень, каб потым канчаткова адмовіцца ад таго, што ёй супрацьпаказана. У выхадныя, калі няма доктара, яна асаблівa «адцягваецца», ходзіць курыць, колькі хочацца.

Ёй у палату прыносяць ежу. І на маіх вачах пацыентка патыкала відэльцам у вячэру ды і адсунула ўбок. На тумбачцы ў яе стаяць аранжавая газіроўка, чыпсы. А яшчэ сяброўка расказвала, што яна ходзіць у краму насупраць, купляе чабурэкі, адным словам харчуецца тым, што забаронена. Што гэта, татальная недасведчанасць, абыякавасць да сябе і дзіцяці, якое даглядае яе маці, ці нейкая іншая з'ява нашага часу, якая цяжка паддаецца кваліфікацыі?

Недасведчанасць адразу можна адкінуць, цяпер інфармацыі ў інтэрнэце хоць адбаўляй, пра здаровае харчаванне і шкоду курэння з кожнага праса гавораць. Абыякавасці як быццам бы няма, яна з удзячнасцю гаворыць пра доктара, што дапамог падняцца. Выходзіць, раённы ўрач са скуры вылузваўся, раіўся з калегамі, у пэўнай меры рызыкаваў дзеля таго, каб яна паднялася з ложка і пабегла ў курылку? І для гэтага ж яе маці кожны тыдзень ходзіла ў царкву, замаўляючы малітвы... Не варта шукаць адказы на пытанні там, дзе гэтых адказаў няма.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# У МАГІЛЁВЕ РАЗДАЛІ КРЫШТАЛЬНЫЯ АЛОЎКІ

XIX Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка-2016» назваў пераможцаў

**Тры дні ў Магілёве, Бабруйску і Быхаве панавала атмасфера дзяцінства — у кінатэатрах круцілі мульцікі, адбываліся цікавыя творчыя сустрэчы з вядомымі аніматарамі, праходзілі прэзентацыі, выставы і майстар-класы.**




У Магілёве паглядзець мульцікі можна было нават на вуліцы — кінатэатр «Радзіма» дэманстраваў іх на адкрытым экране. Усяго на працягу форуму было паказана больш за 380 аніматарскіх стужак з 45 краін свету. Вельмі насычанай і разнастайнай стала і конкурсная праграма. На дыпломы пераможцаў і вялікі крыштальныя аловак — а іх было ўсяго 7 — прэтэндавала 103 фільмы з 34 краін. І нават кампетэнтнаму міжнароднаму журы пад старшынствам легенды сусветнай мультыплікацыі Леаніда Носырава не так проста было назваць пераможцаў.

У выніку Гран-пры фестывалю дастаўся мультфільму «Налім Малiныч» з цыкла «Гара самацветаў» расійскага рэжысёра Сцяпана Бірукова. Лепшым фільмам для дзяцей стала кінастужка «Вялікія канікулы» рэжысёра з Бельгіі Караліны Нуквэс-Боўрчат. Калектыў аўтараў «Атэлье Collectif» з гэтай жа краіны атрымаў дыплом за лепшы эксперыментальны фільм «Непраходная Зона». У намінацыі за лепшае мастацкае рашэнне перамагла беларускі рэжысёр Алена Піткевіч з фільмам «Марк Шагал. Пачатак». Дыплом «Майстру» ўручылі ганароваму кінематаграфісту Расійскай Федэрацыі Веры Кудраўцавай. Лепшым дэбютам названы стужкі «Дэвіт» нямецкага рэжысёра Дэвіда Янсена і фільм «Чхая» індыйскага рэжысёра Дзебанджана Нандзі.

Асобна праводзіўся конкурс сярод юных аніматараў, у якім удзельнічалі дзеці з 5-гадовага ўзросту. Сёлета на малы крыштальны аловак прэтэндавала 69 работ аўтараў з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы, Бельгіі.

Сваіх пераможцаў вызначалі і ў конкурсе дзіцячага выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці. На фестываль было прадстаўлена 439 работ з Беларусі, Расіі, Кыргызстана, Малдовы, Балгарыі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Факт

## Заблытаўся ў сетках

**У Салігорскім раёне работнікі МНС выратавалі чалавека, які тануў. Мужчына заблытаўся ў рыбалоўных сетках.**

Здарэнне мела месца а палове дванаццатай ночы: ратавальнікам паведамілі, што на Случы каля вуліцы Надрэчнай у гарпасёлку Старобін тоне чалавек. На месцы высветлілася, што на процілеглым баку ракі ў рыбалоўных сетках заблытаўся мужчына. Пасля выратавання яго шпіталізавалі з дыягназам «пераахаладжэнне». Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, згодна з папярэдняй інфармацыяй, пацярпелы заблытаўся ў сетках і не змог выбрацца з іх самастойна, калі сам жа ўстанаўліваў гэтыя забароненыя прылады рыбалоўства.

## Чым парадаваў лясны «ўраджай»

**За сёлетні сезон прадпрыемствы Міністэрства лясной гаспадаркі нарыхтавалі больш за 135, 3 тоны дзікарослых пладоў і ягад.**

Калі гаварыць пра асобныя пазіцыі дзікарослай прадукцыі, дык сярод абласных лесагаспадарчых аб'яднанняў можна назваць і своеасаблівых лідараў, паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе Мінлясгаса. Так, найбольш чарніц сёлета было нарыхтавана на Міншчыне — 24,9 тоны. Лідар па зборы журавін — Гомельская вобласць, дзе ў актыў запісалі 2 тоны гэтых ягад. На Віцебшчыне і Гродзеншчыне лесагаспадарчыя аб'яднанні нарыхтавалі па 29,9 тоны яблыкаў-дзічак. Увогуле іншых ягад у Гомельскай і Магілёўскай абласцях сёлета было сабрана па 27,43 і 1,09 тоны адпаведна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.14 | 17.31 | 9.17 |
| Віцебск — | 8.08 | 17.17 | 9.09 |
| Магілёў — | 8.04 | 17.21 | 9.17 |
| Гомель — | 7.56 | 17.23 | 9.27 |
| Гродна — | 8.29 | 17.47 | 9.18 |
| Брэст — | 8.24 | 17.52 | 9.28 |

## Месяц

*Маладзік 30.10 — 06.11.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

*Пр. Пелагеі, Анатоля, Васіля, Канстанціна, Мікалая, Сяргея, Уладзіміра.*
*К. Сільвіі, Губерта, Марціна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +4..+6°С | КІЕЎ +2..+4°С | РЫГА 0..+2°С |
| ВІЛЬНЮС +1..+3°С | МАСКВА -3..-1°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -1..+1°С |

# УСМІХНЕМСЯ

Дзве сяброўкі.
— Чакаеш прынца на белым «Лексусе»?
— А, абы чалавек быў добры! Колер кузава значэння не мае.

**Завяшчаю свае цела навуцы. Каб навукоўцы будучага ведалі, як выглядалі людзі без татуіровак.**

Спявала сёння ў «караоке». Падышоў нейкі мужык, даў мне 10 рублёў з умовай, каб я замаўчала. Зразумела, што зараз магу гэтым зарабляць.

**— Саша, тэрмінова пабяцай, што ты ажэнішся з нашай Марынай!**
**— Сямён Іванавіч, паабяцаць магу! Але ажаніцца не абяцаю!**

Пераходны ўзрост — гэта калі ў спякоту не ведаеш, чаго больш хочацца: марожанага ці піва.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4286.
Нумар падпісаны ў 19.30 2 лістапада 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12